# Ігар Пракаповіч

# Я вас каханнем растрывожу

Мінск

Ілюстрацыі *Аксаны Марозавай*
Малюнак на вокладцы
*Наталлі Зямчонак*

© І. Пракаповіч, 2005
© А. Марозава, ілюстрацыі, 2005
© Н. Зямчонак, вокладка, 2005

*Ідуць халады з поўначы,*
*марозу трашчаць аковы.*
*Ні суму няма, ні роспачы,*
*а толькі малітвы словы:*
*«Нічога няма на свеце*
*мацнейшага, чым маўчанне.*
*Нічога няма на свеце*
*чысцейшага, чым каханне…*

# I
# *Каханка*

* * *

А вечар быў ціхі.
Як быццам на свеце
Ніколі яшчэ
Не бывала бяды,
Як быццам ніколі
Не плакалі дзеці
І надта зарана
Ня мёрлі дзяды.
Як быццам ніхто
Не зрываў яшчэ кветак у полі,
Як быццам яшчэ
Чалавек і ня думаў пра зло.
І мірна пасліся
У тумане бялюткія коні,
І ўсе шанавалі
Душы неразбітае шкло.
А вечар быў ціхі...

* * *

Ты скажы мне што-небудзь пяшчотнае,
Нечаканае, незвычайнае.
У тваім голасе мова родная
Майму сэрцу — зара світальная.
Ці ў вечар, ці ў ноч дажджлівую
Пра таемнае, пра жаданае
Ты скажы мне што-небудзь, мілая,
Ты скажы мне, мая каханая.

* * *

Восень міне бясследна,
выпадзе снег бледны,
контуры родных даляў
ахутае белы дым.
Будзе жыццё будзённым,
жыць будзем манатонна
сярод сумётаў зім.

Хата, яда, работа.
Кожны дзянёк — турботы.
Час незаўважна, ціха
будзе ў вечнасць плыць.
Стому душа адчула,
сэрца ўгрудзях заснула,
і цяпер моцна спіць.

Толькі аднойчы ранкам
знойдзе мяне каханка,
і прынясе пачуцці,
каб растапіць мароз.
І з-пад лядовыгх нетраў
з'явяцца раптам кветкі
з кроплямі шчырых слёз.

Хочацца, каб збылося
тое, што сэрца просіць,
хочацца,каб да зорак
зноў узляцеў мой дух...
Але ж навокал — холад,
сумна паўсюль і голад.
І веташок патух...

* * *

Мне даўно гэты вобраз прысніўся
Ён са мною ідзе па жыцці.
Вось і ўвосень ізноў праявіўся
Белы профіль на чорным лісці.

Валасоў залацістыя пасмы
І зімовасць сцюдзёных вачэй
Выплываюць з эфірнае плазмы
І зіхцяцца ярчэй і ярчэй.

Я ўглядаюся ўважліва ў рысы,
Зразумець і спасцігнуць хачу,—
Толькі контуры, толькі абрысы,
І ніякіх агнеў уваччу.

Раздражняе халодная з'ява,—
Лісце чорнае ў печцы палю,
Але зноў узнікае праява
На гарачай паверхні агню.

І агонь адчыняе мне сховы,—
З кожным вогнішчам профіль ярчэй.
Размякчаецца погляд суровы
І цяплеюць ільдзінкі вачэй.

Я, напэўна, ранейшым застаўся,
Ды падоўгу сяджу ля агню.
Можа я ў Яе закахаўся...
Можа я Яе, проста, люблю...

* * *

Вы — мая каханка.
Вас няма на свеце.
Я прыдумаў вобраз
і саткаў з вятроў:
у валасах белых
залацісцы месяц,—
ён магічным ззяннем
вабіць мяне зноў.

У часы самоты,
у часы спакою,
клічу я каханку
з нетраў небыцця.
І яна прыходзіць,
каб пабыць са мною,
каб размыць граніцы
штучнага жыцця.

У палон фантазій
патрапляе сэрца,
і спрабуюць вусны
адшукаць шчаку.
А каханка шэпча:
«Толькі пасля смерці

я для пацалунку
Вам падам руку».

У вакне вячэрнім
праплываюць мроі,
зіхацяцца зоркі,
надыходзяць сны.
Дзякуй жа, каханка,
што ты ёсць са мною
у часы самоты,
у пару вясны...

### *Самотнай*

Вы ўваходзіце ў мой дом
                    такой самотнай,
нібы на Вас ляжыць праклён
                              вядзьмаркі моднай.
Нібы таемны рытуал —
                    і чары, мроі.
Гарыць агонь. Блішчыць кінжал.
                    І ў пакоі
ёсць толькі Вы, ёсць толькі я,
                    святло ад свечкі.
Знікаюць неба і зямля
                    у вечнасць.
Мы з Вамі блізкія ва ўсім —
                    і я самотны,
таму й кахаю, пэўна, Вас
                    ад адзіноты...

* * *

Калі Вы прыйдзеце адна
У сон, які не паўтарыцца,
Я вып'ю,
          вып'ю Вас да дна,—
І не змагу напіцца.

Вы — мой нектар. А тэты свет

Так жорстка ў вочы пазірае.
Са мною Вы — і я — паэт,
Бо зноў бунтую і кахаю.

Хай кажуць класікі любві,
Што непрыгожа піць жанчыну.
Не дазвалялі й каралі...
Я вып'ю Вас. Хоць на хвіліну.

Вам не вярнуцца больш у сон.
Вам не глядзець у вочы свету.
Я чую меладычны звон,—
І пакідае ён планету...

* * *

Пацалуй мяне, каханка,—
ўжо світальная заранка
зіхаціцца на люстэрку
чырванеючай зары.
Нам растанне — да сустрэчы,
а сустрэчу дасць нам вечар,
дарацць зоры і нябёсы,
ды зязюля ў бары.

Наша хуткае каханне
прамільгне, як тэта ранне,
хвалі змыюць вельмі хутка
нашы босыя сляды.
Толькі слоў пяшчотных вецер
будзе жыць на белым свеце
у халодных промнях зорак
і ў цяпле начной вады.

Не сумуй, мая каханка,—
будзе ноч, і да світанку
жарам вогнішча начное
нам падорыць цеплыню.
З намі будзе тайна ночы,
і запомняць вочы вочы,
і запомняць рукі рукі

пал сусветнага агню.

...У вадзе блішчыць заранка...
Пацалуй мяне, каханка.
Да сустрэчы на змярканні
ў час вячэрняе зары.
Хай жыццё не паўтарыцца,—
будзем жыць і весяліцца,
і кахаць, пакуль каханне
як заранічка гарыць.

Пацалуй мяне, каханка...

* * *

Я Вас каханнем растрывожу,
Я адагрэю Вас дыханием.
Я ненармальны троху, можа.
А, можа, п'яны ад кахання.

На Вашых косах колер снежны,
На Вашых вейках лёду слёзы
І замярзаннем непазбежным
Вашых вачэй глядзяць марозы.

Я ў абдымках Вас сціскаю
І засцілае вочы дымка.
Мне шэпчуць вусны: «Я растаю.
Я стану ў небе невідзімкай».

А я ня чую гэтых словаў,
Нібы багіню Вас цалую.
А кроплі стукаюць па долу,
А я ня чую, я — ня чую...

Я ненармальны, мусіць, троху,
Бо п'яны, п'яны ад кахання.
Я цалаваў Вас дужа многа
І растапіў сваім дыханнем...

* * *
Я Вас кахаю...
Так, я Вас кахаю
— За што?— спытаеце.
— Ды ні за што, а так.
Вось так, як я жыву,
як верш для Вас складаю.
Ва ўсім — глыбокі сэнс,
на ўсім — таемны знак.

Нам сэрца Богам дадзена...
Жыццё нам Богам дадзена...
Каб мы каханнем мерылі
штодзённа прыгажосць,
бо тое ўсё ня вечнае,
што ў душы украдзена,
і там, дзе няма шчырасці
заўжды пануе злосць.

— Як дзіўна Вы гаворыце...
Як у царкве гаворыце...
Напэўна Вы і верыце,
што ёсць на свеце Бог?
— Вядома... Тэта ж — ісціна.
У гэтым шумным горадзе
бяз Бога і бяз шчырасці
знайсці б я Вас не змог.

Калі ў каханне верыце,
то Вы і ў Бога верыце...

* * *
Вы свечку запалілі ў вакне,
бо б'е пярун, і бліскае маланка.
Дарогу Вы паказваеце мне
з прамоклай цемры да сухога ганка.

Вядома Вам, як цяжка мне ісці,—
чужая гразь, чужыя пні і дрэвы,
хоць родны я вось гэтай во зямлі,

хоць помню яе словы, яе спевы.

І многа хат, ды ў кожнай — толькі сны,
на шыбах чорных — штораў таямніцы.
Вы адчуваеце, што з Вамі мы адны
на гэтым свеце, што ў пекла мчыцца.

Раней здавалася планета, як сусвет,
а зараз — толькі свечка ў прасторы.
Нам з Вамі разам куплены білет
ляцець палаючы, туды, дзе зоры...

Ляцець, палаючы...
                    Пакуль жа ў начы
ісці праз цемру мне да свечкі, што палае.
А Вам на неба праз акно сачыць —
калі ж, нарэшце, зорачка зазззяе...

### ***Песня***

Вы — як паветра над ранішнім полем,
Вы — як вясёлка ў кроплях дажджу:
Чорныя вочы, чорныя бровы,
Як жа я Вас люблю!

Вечар самотны загляне ў вокны,
Час развітання напоўніць пакой,—
Чорныя бровы, чорныя вочы,
Што Вы зрабілі са мной?

Песня сарвецца на ласкавай ноце,
Рэхам балюча ў душы зазвініць.
Чорныя бровы, чорныя вочы,
Як жа без Вас мне жыць?

* * *

Уяві: я табе падару цэлы горад
                    з півоняў і руж,
І ты будзеш купацца ў іх,

як яшчэ не купаўся ніхто,
І ты станеш хваліцца прад кожным з людзей
падарункам маім,
І, напэўна, за тэта ты будзеш мяне
яшчэ болей любіць.

Але кветкі завянуць, пасохнуць
і зсыпецца з іх прыгажосць,
І пялёсткі загубяць цнатлівасць
і, шэрыя, лягуць на дол.
Тонкі водар рассеецца ў небе
і дзесці збярэцца ля зор,
Сум агорне цябе і маркота
ўвойдзе ў твой дом.

Не сумуй... На зямлі
вечных рэчаў, пачуццяў і думак няма,
І каханне, як ружа, ўспыхніць,
а потым — згарыць.
Мы жыццё свае мусім
спакойна і ціха пражыць
І падзякаваць Бога
за горад з півоняў і руж...

## *Касцёл святой Ганны*

Ёсць у Вільні касцёл.
Яго вежы ірвуцца да неба.
Як каханне, якому прытулак — Сусвет.
Ён для тых, каму вера
у дні развітальныя трэба,
Ён для тых, каму клінам
Сышоўся рамонкавы свет.

Тут на раны душы
Льюць гаючыя гукі аргану,
Тут паломнікі шэпчуць
Імёны каханых сваіх.
І ўзлятае пад купал:
«Святая заступніца Ганна,

Веры дай у любоў,
Да кахання святога вярні...»

У натоўпе людзей
Пад абраз сваю свечку пастаўлю,
Прашапчу, як і ўсе
Імя любай дзяўчыны сваей.
Перад Богам яе
У касцеле чырвоным услаўлю.
Папрашу аб спагадзе,
Заступніцтве Ганны святой.

Адзавецца касцёл,
І ў рэху імя адгукнецца.
Пагубляюцца літары
І я пачую тады
Мілы шэпт, як трымценне
Каханага блізкага сэрца:
«...анна, ...анна...»
І ціха заплачуць званы...

### ***Раманс***

Што за ноч за вакном —
ні цяпла, ні святла
І апошні агеньчык заснуў у сяле.
Толькі ценем кажан
прамільгне ў вакне,
Толькі сумны чарот прашапоча вадзе:
Я кахаю Вас,
Я кахаю Вас,
Я кахаю Вас.

Адышлі, адплылі
мроі дзён залатых.
Ты кахаў і ўсе так кахалі цябе,
А цяпер у начы свечкі зніч на стале,
І нікога наўкол, хто б шапнуў ціішыне:
Я кахаю Вас,
Я кахаю Вас,

Я кахаю Вас.

Над халоднай зямлёй
ціха зорка гарыць
І па вуліцах сонных самота брыдзе,
Ды ад саду туман прэлы водар нясе,
І, цалуючы, шэгіча прызнанне расе:
Я кахаю Вас,
Я кахаю Вас,
Я кахаю Вас.

Што за ноч за вакном —
ні цяпла, ні святла.
Залаты ўспамін у мінуласць вядзе.
Там іскрыцца агонь на азернай вадзе,
І там шэпча дзяўчына каханая мне:
Я кахаю Вас,
Я кахаю Вас,
Я кахаю
Вас...

# *II*
# *Недзе*

***Бар'ер***

Я сёння лётаў у ва сне
Над нашым горадам паўночным
І ў кожнай постаці жаночай
Шукаў, каханая, цябе.

Ды ноч самотны правіць баль,
Ды месяц хутаюць туманы.
Ліхтар адзіны каля крамы
Блішчыць, як збэшчаны караль.

А я ляцеў. І верыў я.
Што вера верай адгукнецца,
Што тваё сэрца адзавецца
На жар святога пачуцця.

І што мы разам паляцім
Над нашым горадам паўночным
Туды, куды душа захоча,
Туды, дзе шчасця Бог хадзіў.

...Ня верыш ты... Няма цябе...
Сумненне ўзлёт не дазваляе.
Ты спіш, а зорка памірае.
І холадна ў тумане мне...

* * *

Здасца раптам, што ты не са мной,
Здасца раптам, што ты не мая.
Што рабіць? Як мне жыць?
Як агонь
І гарыць, і палае зямля...

Пэўна мне не дажыць, а згарэць,
Пэўна мне мяккіх слоў не чакаць.
Толькі б гэткага болю ня мець,
Толькі б праўды такой не шукаць.

Не чапайце, ня рушце агонь!

Паглядзіце! — згарае зямля!
...Мне здалося, што ты не са мной,
...Мне здалося, што ты не мая...

* * *

Вераснёвыя ночы.
Дзявочыя сумныя вочы.
Голас далекі
і блізкія плёскі вады.
Дзесць цецярук
на далекай амшары балбочыць.
Ссохлыя зёлкі
зжынае туман малады.

У самоце вачэй
вераснёўская цемра начэй,
сховы таемныя,
жар закаханай душы...
Восенню ўсё
робіцца значна прасцей.
Ты пра каханне
мне болей ужо не кажы...

* * *

Уздыхну і з тугой пагляджу ў далячынь...
Там танцуе ў паветры асенні лісток.
Павуцінка самоты павольна ляціць,
І нікога няма сёння побач са мной.

Магу йсці у той бок, дзе туман устае,
А магу і туды, дзе імжыць лістапад.
Я з каханнем сваім развітанне пачаў
І чакаю зімы, як ратунку ад слёз...

* * *

Ты сказала, што хутка надыйдзе зіма,
І пачуцці замерзнуць у скрусе завей,
Што ніякага ўжо паратунку няма

Ад растання, што рве нас мацней і мацней,

Што нідзе мы ня знойдзем світальнай зары,
Што шляхі нашы стройка ідуць пад адхон,
І што душы каханнем жылі да пары,
А цяпер над усім і адчай, і праклён.

Ну а я будаваў за палацам палац,
Я ішоў да цябе цераз церні і золь,
Ды шляхі завялі на забруджаны пляц,
Дзе нікога няма — толькі роспач і боль...

* * *

І зноў настане дзень,
І хтосць будзе спяваць,
А. мне ўжо па расе
У жытах не начаваць.

А мне ўжо ў палях
Не бавіць час з табой -
Лясы ў салаўях
Апалены зімой.

Апалены тугой
Расстанняў даўні час:
Балючай цішынёй
Вітае памяць нас.

Нагоніць вецер хмар,
Пагасне зор святло.
Які цяжкі ўдар —
Усё было! Было...

Няма тваей віны,
Няма віны маёй.
У сховах цішыні
Народзіцца спакой.

І болей па расе
Слядоў не пакідаць...

Ні мне ўжо, ні табе
ў палях не начаваць...

* * *

У час, што вызначаць нябёсы,
Пагасне свечка ў вакне
І нехта блізкі вытрыць слёзы
І ў цемру раннюю шапне:
«Яшчэ не час, каб раставацца,
Яшчэ ня выпіта віно...»
А вольхі ў такт будуць качацца,
І птушка будзе біць крылом.
І раптам жалем сэрца сцісне,
На вочы спусціцца смуга.
...А вецер рве ў вольхах лісце,
І б'е ў вакно крылом туга...

* * *

Ну вось і ўсё...
Каханне пахаваў.
Паставіў крыж.
І слёз ня ліў.
Маўчаў.
Былыя дні
ня будзяць успамін,
б о я заўжды
і ў дзень, і ў ноч
адзін.
Жыві і ты...
І ценяў не будзі,
бо так лягчэй
бяз дум і слёз
ісці.
Забудзе час
вар'яцтва і падман,—
пакіне казку,
толькі казку
нам...

* * *

Недзе ў полі ціха-ціха...
Недзе ў небе зорна-зорна...
За акном маім адліга
Плача слёзна, плача горка.

Мне жанчына гаварыла,
Што каханне ёсць на свеце,—
Я но, проста, зрок згубіла,
Хоць і ходзіць побач недзе.

А мы сумныя размовы
Адашлём у ноч сляпую,
У спадзяванцы, быццам, словы
Шчасце знойдуць і ўратуюць.

І што вернецца каханне
У пакой, дзе зрок згубіла,
І ўспомніць тое ранне,
Калі сонца дзень будзіла.

А пакуль у ноч адліга
Плача слёзна, плача горка...
Недзе ў пол і ціха-ціха...
Недзе ў небе зорна-зорна...

* * *

Калі скончыцца час развітанняў,
Я табе раскажу пра каханне,
Пра світанні над сіняй ракой,
Пра чаканне сустрэчы з табой.

Новых слоў не прыдумаю, пэўна,
Назаву я цябе каралеўнай,
Назаву я цябе званочкам,
Назаву цябе шчасця дочкай.

Ведай толькі, што ў час спаткання
Я табе раскажу пра каханне,
Як світанні адзін сустракаў,

І як доўга цябе чакаў...

* * *

Рэчка Мядзелка.
Травы духмяныя.
Цішыня і спакой,
быццам рай.
Ты са мною,
мая каханая,
Як надзея
і як адчай.
Ты глядзіш на мяне
з усмешкаю,
Я ў вачах
не знаходжу дна.
Тэты дзень
мне здаецца вечнасцю,
А жыццё —
прадаўжэннем сна.
Дні праходзяць
як абакраныя.
Як далека
той ліпень-рай!
...Ты і сёння са мной,
каханая,
Як надзея
і як адчай...

* * *

Плыве па Нарачы вянок,—
Застаўся ад купальскай ночы.
Ён кінуты рукой дзявочай,
Але мяне знайсці ня змог.

І аж да сённяшняга дня
Яго нясуць, ганяюць хвалі.
Лісты ўжо з дрэў паападалі.
Плыве вянок. А дзе Зямля?

І дзе дзявочая рука,
Што той вянок пляла ў надзеі?
...Мы безнадзейна пасталелі
І развучыліся кахаць...

* * *

Калі ноч за акном
і апошняя зорка ляціць
Праз настылую мглу
без надзеі на дзень і святло,
Застаецца адно —
адзіноту самотную піць,
І п'янець ад тугі,
што каханне ў цемру сышло.

А халодная ноч
будзе зоркай крамсаць небасхіл,
Адбіваць на зямлю
рысы твару, што нельга забыць.
Я ў келіх налью
адзіноту нябесных чарніл
І нап'юся ізноў,
бо яшчэ не магу не любіць.

* * *

Вабіш чароўнай усмешкай...
Зорным трывожным дажджом
Мы галактычнаю сцежкай
У розных сузор'ях ідзём.

Здасца, што мы ўжо побач
Толькі руку працягнуць...
Ценю хістлівага морач
Ледзь паспявае мільгнуць.

Як у хаванкі гуляем...
Зоркі блішчаць на шчацэ.
Я безнадзейна сціскаю
Цень у халоднай руцэ...

* * *

Увайдзі ў начное святло,
Што ліецца ад зор на зямлю...
Ты ці памятаеш, як даўно
Гаварыў табе нехта «люблю»?

І ў гарачае полымя руж
Апранаў урачысты пакой,
Каб праз мроіва бедаў і сцюж
Захавалася ў сэрцы цяпло.

І хай ружы заснулі ў снягах,
І ў пакоі больш сціплы букет,—
Увайдзі па забытых слядах
На спатканне са мной у Сусвет...

### *Праз 10 гадоў*

Імгненны погляд... І не разабраць
ці то здзіўленне ў ім,
ці то жаданне?
Што ў мінулым можна адшукаць?
Ці крык ад роспачы?
Ці то каханне...

Прамоклы горад... Лужыны вачэй.
Якая шэрасць там!
Якая мутнасць!
Сцякае неба кроплямі з плячэй.
І ўсё — як прывіднасць...
І ўсё — як штучнасць...

Імгненны погляд... Ён не для мяне.
Кахання зорка
у вадзе астыла.
Вось і жыццё, напэўна, так міне
як твар жанчыны,
што мяне любіла...

### *Вальс*

Час да часу дадасца
і мінуе стагоддзе,
і ў далі нябачнай
не сустрэнемся мы.
Будуць людзі змагацца,
будуць людзі кахацца
на прыгожай і шчырай
беларускай зямлі.

Ты ня думай, што сэрца
мае ціснецца з жалю,—
у прыроды-матулі
ўсім адзіны закон:
ёсць пара ў прызнання,
ёсць пара ў кахання,
ёсць пара ў весялосці,
што завецца жыццём.

Калі праўду, бывае,
я шкадую ўпотай,
што ў прорве стагоддзяў
мы — хвілінкі жыцця.
А хацелася б доўга,
а хацелася б моцна
і кахаць, і каханай
мне цябе называць.

ўсе на свеце цудоўным
не мінае дарэмна:
за світаннем — світанне,
прыгажэе зямяя.
Толькі рухам няўлоўным,
толькі сумам пяшчотным
застануцца ў Сусвеце
ты, каханне і я...

* * *

Я, напэўна, прыдумаў каханне,

Мяккі погляд і чорныя вочы,
Я, напэўна, нрыдумаў прызнанне,
Што камусці шаптаў сярод ночы.
Бо адказам на словы мне рэха
Паўтарала малітву да рання.
Хай малітва мне будзе ўцехай —
Я, напэўна, прыдумаў каханне...

# III
# *Жоўтая пасма*

* * *

Жоўтая пасма на цёмным акне
Гэта месяцаў след.

Калі шыпшына стаіць у віне,
Значыць, кахае паэт.

Значыць, нікога няма наўкол
І раскрышыўся свет.

Толькі шыпшына, віно і стол,
І толькі месяцаў след...

* * *

Жанчына пахне як язмін
І спакушае на вар'яцтва.
Агнямі бліскае камін...
У шклянцы блікі зіхацяцца...

Якая ціша за акном!
Там месяц зорны статак гоніць
І спіць даўно суседскі дом,
І ў сне глыбокім казку мроіць.

А тут утульна.
                    Тут камін
Магічна бліскае агнямі.
І тонкім водарам язмін
Прызыўна вабіць у каханне...

***Намагнічаны космас***

Прыхініся, прашу да мяне.
Гэты вечар — туга незямная.
Праз фіранку ў цёмным акне
Намагнічаны космас сцякае.

Я пагладжу твае вал асы,
Пацалую мне любыя вочы,

Каб пазбыцца душэўнай слаты,
Каб пазбавіцца ад адзіноты.

Але подых Сусветаў мацней,—
Шыба гулка дрыжыць, як жывая.
Галактычнае рэха завей
Нешта тонкае ў сэрцы кранае.

І самотнай здаецца зямля,
І ў вечнае вабіць бясконцасць.
Там у ціхіх касмічных палях
Зіхацяцца далёкія сонцы.

Прытуліся, прашу, да мяне.
Адагрэй, растапі маё сэрца.
...Праз фіранку ў цёмным акне
Намагнічаны космас ліецца...

* * *

Гляджу на Вас —
    і спёка на душы,
І мучыць смага —
    хочацца кахання.
Вы побач, але нам
    не перайсці мяжы
Такога
  выпадковага
      спаткання.

Я п'ю вачэй чариявых прахалоду
І не магу напіцца.
    Погляд свой
Хаваеце Вы...
    Быццам бы свабоду
хачу забраць я
    назаўжды з сабой.

Вы любіце.
  Вам хочацца кахаць.
Вы ўжо кахаеце...

                      Спазніліся хавацца.
Я бачу — шчокі Вашыя гарацць,
Пад свэтрам грудзі
                      сталі ўздымацца.
У Вас таксама спёка
                      на душы.
Агністы жар
                      нясцерпна вусны сушыць.
Пажарнік-свет
                      на самае мяжы
дажджом умоўным
                   нашы сэрцы тушыць...

Гляджу на Вас
                      і Вашы вочы
                                      п'ю...

* * *

Водсвет месяца бурштынам на сцяне.
Распранаецца жанчына.
                      Для мяне.

Кава выпіта. І свечка аплыла.
Зноў пласцінку музыка знайшла.

Па праменнях колеру бурштын
Паплылі размовы, нібы дым.
Іх паклікаў месяц вышынёй,
І бязгучным раптам стаў пакой.

...Толькі профіль тонкі на сцяне,
Ды сукенкі шолах ля мяне...

* * *

Ужо вечар, мілая,
На двары — мяцеліца.
Вые вея стылая,
Снег танцуе, сцелецца.

Нібы д'яблы белыя
У сумётах гойдаюць,
Нібы сны нясмелыя
Каля хаты сноўдаюць.

Ты акно завешаеш
І, святла не палячы,
На прасціну свежую
Ляжаш, зазываючы.

Заблішчаць гарэзліва
Твае вочы блізкія
Позірк, быццам крэсіва,
Сноп жаданняў выіскрыць...

Хай пяе мяцеліца
Ды сняжынкі кружацца,—
Мне ў свята верыцца,
Бо законы рушацца...

### *Жоўты мужчына*

Суседка гадае на кававай гушчы,
Суседка пас'янсам раскідвае карты,—
Ёй хочацца стаць адначасна відушчай,
Ёй хочацца ўбачыць наступныя даты.

А болей, напэўна, мужчыну ў чорным,
У белай кашулі з кальцом заручальным,
Хай будзе падобны ён нават на чорта,
Але, каб павёў яе ў адпачывальню.

...Травеньскі хрушч у святле заблудзіўся,
Лапкамі скрэбае ў шыбу акенца.
Здзіўлена месяц на небе спыніўся,—
Жоўцю ў фіранку нячутна ліецца.

Раніцай будзе знямога ў целе —
Сон незвычайны пабачыць суседка:
Жоўты мужчына з ёй будзе ў пасцелі,

ў вазе пакіне ён жоўтую кветку.

...Доўга глядзела суседка на захад.
«Дзякуй» — гарачыя вусны шапталі.
У невядомасць над стрэхамі дахаў
Месяца белыя крылы знікалі...

***Данка***

Прахалода вячэрняя... Зоры...
Постаць мужчыны на ганку.
Недзе за хатай суседа
свеціцца цьмяна ліхтар.
Нешта ня спіцца... Гавораць,
быццам суседская Данка
вернецца хутка дадому...
Божа, чаму гэткі жар?!

Данка... Данута... Данутка...
Што ж тут, здаецца, такога?
Ёй усяго дзевятнаццаць.
Ледзьве не столькі дачцэ.
Можа усяго толькі чутка?
Можа ня будзе нічога?
Вочы чамусці слязяцца...
Кропляй туман на шчацэ.

Вечар, напэўна, слязлівы.
Трэба ж! Якія пачуцці!
Сорамна... Сорамна, дзядзька...
Лепей на жоику глядзі...
Што яшчэ трэба? Шчаслівы.
Цешаць навагаю людзі,
ў хацеі ўпрацы парадак,
добранька ўсё ў жыцці!

Але ж Данута.., Данутка...
Ты ж мяне так цалавала,
ты ж пра каханне шаптала,
ты мяне з глузду звяла!

Хай гэта будзе ня чутка!
Хай бы хутчэй прыяжджала!
Хай бы... Бадай ты прапала
гэтая ноч без святла!

Змрок апусціўся на ганак.
З ціхім вільготным сутоннем
постаць мужчыны злілася
быццам яе не было.
А ў суседскім дварышчы
рыпнула фортка спрасоння:
ў цемры шукаючы шчасце
ціха каханне ішло...

* * *

*Г.І.Леснікаву*

Ці будзе вечар на двары,
Ці будзе ранак,
А ўсё адно, калі памру —
Памру каханым.

Хоць сэрца шчырае баліць,
На сэрцы раны.
А ўсё адно, калі мне жыць,
Дык жыць каханым.

Я ведаў мяккасць цёплых рук,
Як стан нірваны,
І вуснаў шэпт, як сэрца стук,—
«Ты мой, каханы»

Адцаў я сэрца цеплыню
Для пекнай Панны
За словы ціхія:
«Люблю... Люблю, каханы...»

Ці пройдзе год, ці пройдзе век,—
Другім не стану,
Бо ўсё адно, як чалавек,—

Памру каханым...

* * *

Па золату спелага жніўня
ішла ўладарная Восень.
Яе я сустрэў каля прыўня
гадзін, пэўна недзе ў восем.

«Вы вельмі прыгожая, Панна,
пякнейшых не бачыў на свеце!
Адкуль Вы прыйшлі? Мо з туману?
А мо Вас прынёс сюды вецер?

З якіх Вы краёў-далячыняў
у вёску маю завіталі?
Мне Вашае пахкае імя
Апошнія птушкі спявалі...»

Стаяў я на ганку, пытаўся
пра тое, пра гэта, а вецер
ціхонька ў застрэшку смяяўся
маёй бесталковай бяседзе.

«Ня трэба пытанняў,— мне Панна
сказала з таемным паглядам,—
Вазьмі ты мяне, пакуль рана,
у свежым стажку, што за садам».

І я, адурэўшы дазвання
на сене із Ёй мілаваўся,—
такога сляпога кахання
ніколі я больш не дастаўся.

Прыйшлося, нарэшце, прызнацца,
дзе Восень змагла затрымацца...

* * *

Ты кажаш, што я грубіян
і пляту абы што.

І што мой інтэлект
прымітывам асклізлым аплыў.
І ўсе з-за таго, што на грудзі твае
я руку палажыў,
і лашчыць пачаў усе тое,
што ласкі чакала даўно.

Памазгуй — і ўпэўнішся,
што я ня вельмі дурны.
Чалавечай душы
разам з целам і жыць, і канаць.
Нам ня варта
затруннага шчасця чакаць,—
трэба зараз лавіць,
пакуль мы ў Сусвеце адны.

Ты гаворыш пра тое,
што я і ў кніжках чытаў.
Але сэрца тваё — (ты паслухай!)
як той верабей,
зачырыкала так,
быццам трэба вяртацца вясне.
Пачакай!
Я ж табе не ўсе
нават грудзі яшчэ казытаў...

### *Дзіўны танец*

Ты пяшчотныя словы шаптала,
Ты гарэла ў палкім агні,
Ты вар'яцтвам сваім чаравала,
Абяцаючы страсныя дні.

Ды мае схаладнелае сэрца
Гэдак цяжка заставіць гарэць.
Толькі я яшчэ чую, як б'ецца
Яно ў час, калі хоча ўзляцець.

Але клетка грудзей прывучыла
Сэрца голас у цемры трымаць

І патрэбна магутная сіла,
Каб з глыбіняў пачуцці дастаць.

І таму твае мяккія словы
Як у бездань, у клетку плывуць.
Там такія надзейныя сховы,
Там такая магічная муць...

### *На хутары*

Дарога ўтравела. Зарос агарод.
Быллё ахінула хутар.
Дождж сыпіць і сыпіць свой дробны шрот,
Туманамі лог ахутаў.

Але на сцяжынцы жывуць сляды,
І ў шыбе агеньчык б'ецца.
Насуперак дожджу і дню нуды
Ад печкі цяпло ліецца.

А на стале — святочны абрус,
Бульба гарачая ў місе.
Гарэлка. І кветкі. І хлеба кус,
Што лёг на кляновае лісце.
— Даўно ўжо ня еў я сваіх хлябоў...

Чужыя - нібы атрута...
— Частуйся... Частуйся...
Ты доўга йшоў
На гэты забыты хутар.

— Прабач, дарагая... Сатру слязу...
Усе так. Пâблукаў па свеце.
А тут зразумеў: пра цябе адну
Шаптаў мне малітвы вецер.

— Ня трэба, мілы... Я плачу зноў...
Малітвы, знаць, маюць сілу.
Шаптала.., шаптала так шмат гадоў.
Ты верыш мне? Верыш, мілы?

— Каханая...
ў лямпе дрыжэў агонь.
І дзесць пяруны стралялі.
Сівыя валосы сухая далонь
Расчэсвала мазалямі...

* * *

Набывае смак віно,
Набірае моц каханне,
А, здавалася, даўно
Прамінулася світанне.

Калі сонны бляск зямлю
Залаціў у колер свята
Ты шаптала мне «люблю»
І глядзела вінавата.

Гэта зноў не паўтарыць.
Але й заўтра будзе ранне.
Калі нас віно п'яніць,
Значыць ёсць яшчэ каханне.

* * *

У палоне кахання твайго
Я забыўся, што хлеб ачарсцвеў,
Што мільёны сусветаў прайшло,
Пакуль колас наліты саспеў.

Мітуслівы гадзіннікаў стук.
Імі згублена часу хада.
Вось — цяпло тваіх тоненькіх рук,
Вось — праз рукі ліецца вада.

Ты чароўным паглядам сваім
Адмяняеш законы зямлі:
У вулканы хаваецца дым,
І па небу плывуць караблі.

Азірнуся і ўбачу сябе
У наступную сотшо гадоў.
А мінулае знікла. Нідзе
Не відаць маіх ціхіх слядоў.

Дагараюць хвасты ў камет,
Але ўспыхваюць безлічы зор.
І прывычны губляецца свет —
Раскрывае пялёсткі прастор.

Пакуль колас наліты саспеў
Міліёны сусветаў прайшло.
Я, напэўна б, нічога ня меў
Без палону кахання твайго.

* * *

Іграла жанчына...
Скляпеннямі залы
шчымлівае рэха
гукала да Бога,
на крылах мелодый
душа ўзлятала
і ярка свяцілася
ў неба дарога.
І плавіўся дах,
адчыняючы сонца,
ды шэрыя сцены
кудысці знікалі.
Касмічнай прасторай
зіхцела бясконцасць
і вусны малітву
аб вечным шапталі.
А сэрцу, якому
абдымкамі плоці
лунаць забаронена
ў сферах узнёслых,
балюча рабілася...—
толькі на ўзлёце
ў адзінстве злучаюцца
шчасце і слёзы.

Іграла жанчына...
Без дахаў, без залы
мелодыя ціха
над светам лунала.
Ласкавым звярком
пасля шчасця ўзлётаў
душа каля сэрца
ляжала пяшчотай...

* * *

Нейкая далёкая жанчына
сумна усміхаецца..
А я
гавару ёй словы, што Айчына
даражэй кахання
і жыцця....

* * *

Ідуць халады з поўначы,
Марозу трашчаць аковы.
Ні злосці няма, ні роспачы,
А толькі малітвы словы:
«Нічога няма на свеце
Чысцейшага, чым каханне.
Нічага няма на свеце
Мацнейшага, чым маўчанне...»

© OCR: Камунікат.org, 2011 год
© Інтэрнэт-версія: Камунікат.org, 2011 год
© PDF: Камунікат.org, 2011 год

***Змест***

**I. Каханка**

1. «А вечар быў ціхі...»
2. «Ты скажы мне што-небудзь пяшчотнае
3. «Восень міне бясследна...»
4. «Мне даўно гэты вобраз прысніўся...»
5. «Вы - мая каханка...»
6. Самотнай
7. «Калі Вы прыйдзеце адна...»
8. «Пацалуй мяне, каханка...»
9. «Я Вас каханнем растрывожу...»
10. «Я Вас кахаю...»
11. «Вы свечку запапілі ў вакне...»
12. Песня
13. «Уяві: я табе падару...»
14. Касцёл святой Ганны
15. Раманс

**II. Недзе**

1. Бар"ер
2. «Здасца раптам, што ты не са мной...»
3. «Вераснёвыя вочы...»
4. «Уздыхну і з тугой пагляджуў далячынь..»
5. «Ты сказала, што хутка надыйдзе зіма...»
6. « І зноў настане дзень...»
7. «У час, што вызначаць нябёсы...»
8. «Ну вось і ўсё...»
9. «Недзе ў полі ціха-ціха...»
10. «Калі скончыцца час развітанняў...»
11. «Рэчка Мядзелка...»
12. «Плыве па Нарачы вянок...»
13. «Калі ноч за акном...»
14. «Вабіш чароўнай усмешкай...»
15. «Увайдзі у начное святло...»
16. Праз 10 гадоў.
17. Вальс
18. «Я, напэўна, прыдумаў каханне...»

**III. Жоўтая пасма**

1. «Жоўтая пасма на цёмным акне...»
2. «Жанчына пахне як язмін...»
3. Намагнічаны космас
4. «Гляджу на Вас...»

5. «Водсвет месяца бурштынам на сцяне…»
6. «Ужо вечар, мілая...»
7. Жоўты мужчына
8. Данка
9. «Ці будзе вечар на двары...»
10. «Па золату спелагажніўня...»
11. «Ты кажаш, што я грубіян...»
12. Дзіўны танец
13. На хутары
14. «Набывае смак віно…»
15. «У палоне кахання твайго...»
16. «Іграла жанчына...»
17. «Нейкая далёкая жанчына...»
18. «Ідуць халады з поўначы...»

**Пракаповіч І. М.**
Я Вас каханнем растрывожу... - Мн.: Асоль, 2005, - 60 с.

Выданню кнігі паспрыялі:
***Ігар Навумаў,***
***Андрэй Жук,***
***Павел Анціпаў***
Наклад 120 асобнікаў

© OCR: Камунікат.org, 2011 год
© Інтэрнэт-версія: Камунікат.org, 2011 год
© PDF: Камунікат.org, 2011 год